## *КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ЛЮСТЭРКУ ПЕРЫЯДЫЧНАГА ДРУКУ ЗА 2004 г.*

Інфармацыйнае поле Рэспублікі Беларусь па стану за 01.01.2005 г. прадстаўлялі больш за 1400 друкаваных вы-данняў, 7 інфармацыйных агенцтваў, 57 праграм тэлевя-шчання, 130 праграм радыёвяшчання. Дзве трэція часткі ад усіх зарэгістраваных друкаваных СМІ з'яўляюцца не-дзяржаўнымі, тым не менш дамініруюць на інфармацый-ным полі дзяржаўныя выданні, іх тыражы значна перавы-шаюць тыражы недзяржаўных перыядычных выданняў.

Агляд публікацый па праблемах культуры і мастацтва Беларусі за 2004 г. зроблены па матэрыялах штомесячнага бібліяграфічнага паказальніка "Новая літаратура па куль-туры і мастацтву", які фарміруецца на аснове базы даных "Культура і мастацтва Беларусі". Галіновая рэфератыўна-бібліяграфічная база даных генерыруецца аддзелам навуко-вай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва Нацыя-нальнай бібліятэкі Беларусі (НББ) з 1995 г. і ўключае на 01.01.2005 г. звыш 75 тыс. анатаваных запісаў на кнігі, навуковыя манаграфіі, брашуры, каталогі выставак, збор-нікі, матэрыялы канферэнцый, дысертацыі, аўтарэфераты дысертацый, артыкулы са зборнікаў і серыяльных выдан-няў, а таксама на публікацыі з часопісаў і газет, у тым ліку на асноўныя артыкулы з рэгіянальных газет, па пы-таннях гісторыі, сучаснага стану і перспектыў развіцця на-цыянальнай культуры і мастацтва. Прадметная вобласць: агульныя пытанні культуры, культуралогія, культурная палітыка, міжнародныя сувязі ў галіне культуры і мастац-тва, бібліятэчная справа, бібліяграфія, музеі і ахова помні-каў гісторыі і культуры, музычнае, тэатральнае і кінамас-тацтва, эстрада, цырк і харэаграфія. Па тэматычнаму і храналагічнаму дыяпазону гэта максімальна поўнае ад-люстраванне публікацый па вышэйназваных кірунках культурнага і мастацкага жыцця нашай краіны за перыяд 1995–2004 гг., якія паступілі ў фонды НББ.

Агульная колькасць матэрыялаў за разглядаемы пе-рыяд склала каля 12 тыс. публікацый, большая частка якіх – артыкулы з газет і часопісаў. Колькасць апрацава-ных крыніц, якія змяшчалі публікацыі па культуры і мас-тацтву, перавышае 150 назваў перыядычных выданняў. Галіновыя рэспубліканскія выданні – штотыднёвая газета ***"Культура"*** і штомесячны часопіс ***"Мастацтва"***, безумоўна, з'яўляюцца лідэрамі па колькасці (каля 11% ад гадавога аб'ёму інфармацыі па пытаннях культуры і мастацтва) як інфармацыйных, так і найбольш значных аналітычных ма-тэрыялаў, прысвечаных культурным і мастацкім

акцыям, навуковым мерапрыемствам рэспубліканскага і рэгіяналь-нага ўзроўню. Назіраецца ўстойлівая тэндэнцыя ўзрастан-ня колькасці артыкулаў па самых розных праблемах галі-ны ў рэспубліканскіх, абласных і асабліва гарадскіх газе-тах. Паколькі матэрыялы з дзяржаўных рэспубліканскіх і абласных газет і часопісаў прадстаўлены ў паказальніку максімальна поўна, то нават самы беглы агляд іх дазваляе ўявіць дастаткова аб'ектыўную карціну адлюстравання ў прэсе самых розных аспектаў гісторыі і сучаснага стану нацыянальнай культуры і мастацтва ў дзяржаўных друка-ваных СМІ.

Пастаянна ў полі зроку ўсіх друкаваных СМІ знаходзі-ліся важнейшыя напрамкі дзейнасці структур улады ў рэа-лізацыі дзяржаўнай палітыкі ў сферы культуры: стварэнне нарматыўна-прававой базы культуры; фарміраванне эфек-тыўнага эканамічнага механізма; стварэнне ўмоў для раз-віцця творчых здольнасцей кожнага грамадзяніна краіны; захаванне гісторыка-культурнай спадчыны; умацаванне кадравага патэнцыялу і матэрыяльна-тэхнічнай базы ўста-ноў культуры; развіццё міжнароднага культурнага супра-цоўніцтва і інш.

Вялікі рэзананс у прэсе маюць культурныя праекты, фестывалі нацыянальнага і міжнароднага ўзроўню прафе-сійнага мастацтва і народнай творчасці, многія з іх сталі традыцыйнымі: Міжнародны фестываль мастацтваў “Сла-вянскі базар у Віцебску”, Мінскі Міжнародны кінафесты-валь “Лістапад”, Міжнародны музычны фестываль “Залаты шлягер” у Магілёве, Міжнародны тэатральны фестываль “Белая вежа” ў Брэсце, Міжнародны фестываль мастацтваў ”Беларуская музычная восень”, Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску, Міжнародны музычны фестываль імя І.І. Салярцінскага, Рэспубліканскі фесты-валь камернай музыкі “Музы Нясвіжа”, міжнародны кон-курс “Музыка надзеі”, Нацыянальны конкурс прыгажосці “Міс Беларусь”, Усебеларускі фестываль нацыянальных культур, Усебеларускі фестываль народнага мастацтва “Бе-ларусь – мая песня”, Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў сяла “Дажынкі”, міжнародны фестываль на-роднай музыкі “Звіняць цымбалы і гармонік” у Паставах, Рэспубліканскі фестываль рэгіянальнага фальклору “Па-лескі карагод” у Пінску, Рэспубліканскі фестываль аматар-скага тэатральнага мастацтва “Тэатральныя скрыжаванні” і інш. Шмат публікацый у прэсе было прысвечана падрых-тоўцы і ўдзелу беларускіх выканаўцаў у Міжнародным конкурсе песні “Еўрабачанне-2004” – звыш 150 артыкулаў.

Паказальным з’яўляецца і факт павелічэння публікацый (інтэрв’ю, каментарыяў) супрацоўнікаў Міністэрства куль-туры Рэспублікі

Беларусь: міністр культуры Гуляка Л.П. – 13 артыкулаў, першы намеснік міністра Рылатка У.П. – 10; намеснік міністра Гедройц В.К. – 9; начальнік упраў-лення ўстаноў культуры і народнай творчасці Стружэц-
кі Т.І. – 5; паведамленняў прэс-службы Міністэрства куль-туры – каля 15 публікацый, па 1–2 публікацыі некаторых іншых спецыялістаў МК. Публікацыі прысвечаны прыяры-тэтным напрамкам дзейнасці Міністэрства культуры Рэс-публікі Беларусь, культурным акцыям, каментарыям па пытаннях заканадаўчых ініцыятыў, іншым праблемам дзяр-жаўнай палітыкі ў галіне культуры, у тым ліку ўкаранен-ню сацыяльных стандартаў, міжнародным культурным сувязям і г. д. (Гуляка Л.П. "Дзяржаўныя грошы павінны ўкладвацца ў стварэнне высокамастацкіх твораў, якія ма-юць грамадскае гучанне" // Нар. газ. 2004. 27 студз.; Гуляка Л.П. Культура – шлях да гуманізацыі грамадства і чалавека // ЛіМ. 2004. 20 лют.; Гуляка Л.П. Культура як стратэгічная каштоўнасць // Культура. 2004. № 41; Рылат-ко У.П. Русский год под знаком Беларуси// Нар. газ. 2004. 3 сак.; Рылатка У.П. Новыя фільмы, навуковыя распра-цоўкі і моўныя нормы // Культура. 2004. № 3; Стружэцкі Т.І. "Беларусь – мая песня " // Голас Радзімы. 2004. № 8–9; Стружэцкі Т.І. Суквецце нацыянальных культур // Мас-тацтва. 2004. № 5; Казловіч М. "Мы – за прапаганду най-лепшых дасягненняў нацыянальнай і сусветнай культу-ры"// Культура. 2004. № 37 і інш.).
Не абышла ўвагай прэса замежныя візіты міністра культуры Л.П. Гулякі, накіраваныя на развіццё дагаворна-прававой базы міжнароднага культурнага супрацоўніцтва – падпісанне Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж міністэр-ствамі культуры Эстоніі і Беларусі (Культура. 2004. № 35; Рэспубліка. 2004. 31 жн.; Нар. газ. 2004. 28 жн.), падпі-санне Пратакола аб супрацоўніцтве паміж міністэрствамі культуры Балгарыі і Беларусі (Культура. 2004. № 31–32; ЛіМ. 2004. 27 жн.; Бел. нива. 2004. 30 июля).
Вялікая ўвага ўсімі друкаванымі СМІ надавалася між-народным культурным акцыям і навуковым мерапрыем-ствам, сярод якіх Дні культуры Ірана ў Беларусі (Кіслова С. Персідскія матывы // Культура. 2004. 10–16 ліп.; Свирко И. Звучат персидские мотивы в Беларуси // Рэспубліка. 2004. 16 чэрв.; Цімошык Л. Некалькі дзён у іранскім каларыце // Звязда. 2004. 18 чэрв.); Дні культуры Швецыі (Полтав-ская Л. Вспомним Карлсона // Мин. курьер. 2004. 1 июня; Березун Л. Приглашение в страну Астрид Линдгрен // Нар. газ. 2004. 1 чэрв.); Дні культуры Кітая (Гуляко Л.П. Добро пожаловать в Беларусь, искусство Китая! // Рэспуб-ліка. 2004. 19 кастр.; Хэпін Чжоу. Беларусь – прыгожая

кветка ў Садзе свету // Культура. 2004. 23–29 кастр.; Французаў А. Ад выразак з паперы – да экзатычных масак // Культура. 2004. 9–15 кастр.).
2004 г. быў асаблівым у кантэксце культурнага супра-цоўніцтва Беларусі і Расіі. Згодна з рашэннем сумеснай калегіі міністэрстваў культуры нашых краін ён праходзіў як Год культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэра-цыі. Афіцыйнае адкрыццё адбылося 26 красавіка на сцэне Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі балетам С. Пракоф'ева "Рамэо і Джульета", а ўрачыстае закрыццё (13–14 снежня ў канцэртнай зале "Октябрьский" у Санкт-Пецярбургу) стала своеасаблівым пралогам для наступнага этапа культурнага супрацоўніцтва – 2005 г. аб'яўлены Годам культуры Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Бела-русь. Разнастайныя мерапрыемствы ў рамках Года культу-ры Рэспублікі Беларусь, які праходзіў пад знакам святка-вання 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысц-кіх захопнікаў, адбыліся не толькі ў Маскве і Санкт-Пе-цярбургу, але і ў Цюмені, Іркуцку, іншых гарадах Расіі. Агляд шматлікіх публікацый (каля 100 артыкулаў) свед-чыць аб размаху акцыі, цікавасці не толькі беларускай, але і расійскай прэсы да мерапрыемстваў у рамках Года. Вось толькі некаторыя з іх: Рылатка У.П. Год культуры Беларусі ў Расіі пачаўся бенефісам на сцэне вялікага тэат-ра // Голас Радзімы. 2004. 20 мая.; Аверкина Г.К. Год куль-туры Беларуси в России // Лит. газ. 2004. 11 авг. [Інтэрв'ю з саветнікам па культуры Пасольства Рэспублікі Беларусь у РФ]; Швыдкой М.Е. Год и вся жизнь – вместе! // Сов. Белоруссия. 2004. 30 сент.; Григорьев В. От Калининграда до Байкала // Сов. Белоруссия. 2004. 30 сент.; Титаренко Е. С берегов Свислочи – на Москву-реку // Культура (РФ). 2004. № 22; Шиманский М. Праздник в Беларуси, празд-ник в России // Рэспубліка. 2004. 23 чэрв.
Знакавай падзеяй у культурным і грамадска-палітыч-ным жыцці нашай краіны ў канцы 2004 г. сталі таксама Дні культуры Украіны (23–28 лістап.), якія праводзіліся ў адказ на Дні культуры Беларусі ва Украіне ў 2003 г. (Богуцкий Ю. Дружим и поем // Сов. Белоруссия. 2004. 16 нояб.; Бунцэвіч Н. Аўра музычнага сяброўства / Культура. 2004. № 48; Альшэўскі Р. Спатканне са старымі сябрамі // Культура. 2004. № 48; Крэпак Б. І Львоў, і Кіеў, і Луганск // Культура. 2004. № 48; Полтавская Ю. Подарок братской Украины // Мин. курьер. 2004. 10 ноября; Рагойша В. І пайшоў Шаўчэнка ў Беларусь... // Звязда. 2004. 23 лістап.

Належная ўвага на старонках перыядычнага друку на-давалася пытанням дзяржаўнай падтрымкі культуры рэгіё-наў, формам работы клубных устаноў культуры, пошукам пазабюджэтных сродкаў,

дзейнасці сельскіх устаноў куль-туры па арганізацыі вольнага часу насельніцтва, пытанням падтрымкі і развіцця народнай творчасці, самадзейнага мастацтва ўсіх жанраў. Вялікая колькасць матэрыялаў пры-свечана рэспубліканскім і рэгіянальным фестывалям народ-най творчасці. Найбольш прадстаўнічым па колькасці пуб-лікацый, асабліва ў рэгіянальнай прэсе, з’яўляецца II Усе-беларускі фестываль “Беларусь – мая песня”, прысвечаны 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх за-хопнікаў, першы этап якога стартаваў у кастрычніку 2003 г. і ўключаў адборачныя конкурсы і агляды творчых калек-тываў сельскіх, гарадскіх і раённых устаноў культуры. Так, за перыяд з кастрычніка 2003 г. па красавік 2004 г. (першы этап) убачылі свет больш за 60 публікацый.
Самае шырокае адлюстраванне на старонках перыядыч-ных выданняў знаходзіць дзейнасць нацыянальна-культур-ных аб’яднанняў у Беларусі, а таксама дзейнасць беларус-кіх суполак у розных краінах свету (больш за 100 публіка-цый). І хоць большасць артыкулаў носіць інфармацыйны характар і змешчана ў газеце “Голас Радзімы” – спецыялі-заваным друкаваным органе Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Бела-русь, многія рэспубліканскія і рэгіянальныя газеты такса-ма пастаянна трымаюць у полі зроку культурныя і грамад-скія акцыі і ініцыятывы гэтых арганізацый. Асаблівая ўва-га надавалася ў прэсе мерапрыемствам, якія праходзілі ў рам-ках падрыхтоўкі і правядзення V Усебеларускага фестыва-лю нацыянальных культур (крас. 2003 г. – чэрв. 2004 г.), у якім прынялі ўдзел больш за 1700 самадзейных артыс-таў, мастакоў, майстроў народнай творчасці з 38 гарадоў і 28 вёсак Беларусі. Больш за 800 лепшых прадстаўнікоў самадзейнай творчасці 25 нацыянальнасцей, вызначаных рэспубліканскім журы на чале з народным артыстам Бела-русі М. Дрынеўскім, мелі гонар прадстаўляць свае суполкі на заключных мерапрыемствах 4–6 чэрвеня 2004 г. у Грод-не. Падтрымаць сваіх супляменнікаў прыехалі прадстаўні-кі многіх пасольстваў і консульстваў замежных краін у Бе-ларусі: Арменіі, Казахстана, Малдовы, Туркменістана, Таджы-кістана, Украіны, Эстоніі, Польшчы, Карэі і інш. Толькі заключнаму этапу ў Гродне ў дзяржаўных рэспубліканскіх газетах былі прысвечаны 23 артыкулы, у рэгіянальных (аб-ласных і некаторых гарадскіх і раённых газетах) – выяў-лена каля 30 публікацый і рэпартажаў. Цалкам святу быў прысвечаны выпуск Гродзенскай праўды за 8 чэрвеня.

Пры аналізе публікацый па ***тэатральнаму і музычнаму мастацтву***

трэба адзначыць, што вялікая ўвага на старон-ках дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі надавалася пытанням ідэалогіі. Так, у красавіку 2004 г. у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў прайшла Рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя на тэму "Дзяржава і творчая асоба: роля творчай інтэлігенцыі ў фарміраванні ідэалогіі беларускай дзяржавы". Выступоўцы адзначалі, што культура з'яўляецца неад'емнай часткай ідэалогіі, фун-даментам нашай дзяржаўнасці. Значнае месца ў дзяржаў-ным будаўніцтве, фарміраванні будучага нашай краіны займае творчая інтэлігенцыя. Адзначалася, што задачы па распрацоўцы гэтай тэматыкі былі вызначаны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падчас наведвання Беларускай дзяр-жаўнай акадэміі мастацтваў 15 мая 2003 г. Упершыню бы-ла сфармулявана стратэгія ўзаемаадносін творчай інтэлі-генцыі і дзяржавы на сучасным этапе, паняцце ідэалогіі мастацкай творчасці. Наша ідэалогія, як падкрэсліў у сва-ім выступленні першы намеснік міністра культуры Рэспуб-лікі Беларусь У. Рылатка, ачышчана ад класавых і сацы-яльных амбіцый, гэта ідэалогія нацыянальнага адзінства, яго найвышэйшага выяўлення – нацыянальнай дзяржавы. Пытанні, якія былі разгледжаны на канферэнцыі, даклад-на асвятляліся ў артыкуле: Кірпічэнкава Н. Дзяржава і творчая асоба // Культура. 2004. № 17–18.
Вялікую ўвагу грамадскасці прыцягваюць сустрэчы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з кіраўніцтвам творчых саюзаў, дзеячамі культуры і мастацтва краіны. Кіраўнік дзяржавы, адзначаючы важную ролю і значэнне культуры і мастацтва ў жыцці народа і дзяржавы, у выхаванні чала-века – грамадзяніна і патрыёта, свядома ідзе на адкрытую прынцыповую гаворку па ўсіх набалелых пытаннях твор-чага жыцця. Гэтым пытанням прысвечаны артыкул: Грунт для кансалідацыі нацыі // Культура 2004. № 51–52.
Вялікую актуальнасць набыло сёння пытанне аховы аўтарскіх і сумежных правоў. Як вядома, усе развітыя краіны прымяняюць вельмі жорсткія крымінальныя санк-цыі за пірацтва ў галіне інтэлектуальнай уласнасці. Віда-вочна, што і ў нашай краіне неабходна выпрацаваць дзяр-жаўную канцэпцыю і праграму барацьбы з пірацтвам інтэ-лектуальнай уласнасці, для чаго важна ацаніць маштабы пірацтва ў рэспубліцы, тыя матэрыяльныя страты, якія нясуць праваўладальнікі і дзяржава. Розным аспектам гэ-тай праблемы былі прысвечаны артыкулы: Цімошык Л. "Бе-лыя Росы" як чыстыя слёзы. Для каго – вырашаў суд // Чырв. змена. 2004. 13 лют. Дадатак да газ. Звязда (№ 37–38); Чистый Н. "Пираты" интеллекта идут на абордаж // Рэспубліка. 2004. 4 мая.; Янцікава К. Чаму творцы рэдка звяртаюцца ў суд? // ЛіМ.

2004. 16 крас. і інш.

Пытанням ***тэатральнага мастацтва*** ў 2004 г. прысвяча-ліся: у газеце Культура – 108 артыкулаў, ЛіМ – 46, Сов. Белоруссия – 63, Веч. Минск – 73, Мин. курьер – 62, Рэс-публіка – 42, Знамя юности – 38, Настаўн. газ. – 36, Нар. газ. – 32, Звязда – 23, Голас Радзімы – 15, Во славу Роди-ны – 15, Чырв. змена – 7, 7 дней – 8, Бел. нива – 2. У дзяр-жаўных абласных газетах: Заря (Брест) – 9, Віцеб. рабочы – 7, Гомел. праўда – 24, Гродзен. праўда – 10, Магілёўс. праўда – 4, Мін. праўда – 6.
У дзяржаўных часопісах колькасць асноўных публіка-цый па розных аспектах тэатральнага мастацтва складала: Мастацтва – 33, Музыкальнае і тэатральнае мастацтва: праблемы выкладання – 6, Бел. думка – 6, На экранах – 5, Роднае слова – 2, Маладосць – 1, Беларусь – 1, Паза-школьнае выхаванне – 1, Нёман – 3.
Вялікая ўвага на старонках дзяржаўных сродкаў маса-вай інфармацыі надавалася мерапрыемствам у рамках пра-вядзення Года культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі. Гэтаму пасвячаліся такія артыкулы, як: Ахрем-чик Т. Гастроли длиною в год // Нар. газ. 2004. 2 крас.; Елизарьев В. Большие гастроли: 26 апреля в Москве на сцене Большого театра состоится официальное открытие Года культуры Беларуси в России // Сов. Белоруссия. 2004. 22 апр; Орлова Т. Транзитный обмен: в Год культуры Беларуси в России Иркутск и Минск подружились театра-ми // Рэспубліка. 2004. 28 снеж.
Дням культуры Украіны ў Беларусі былі прысвечаны артыкулы: Альшэўскі Р. Спатканне са старымі сябрамі // Культура. 2004. № 48; Ступка Б. Что могут короли? // Сов. Белоруссия. 2004. 8 дек.
У публікацыях, якія адлюстроўваюць тэатральнае жыццё рэспублікі, дастаткова поўна прагледжваецца хроні-ка тэатральных падзей, якая раскрываецца ў артыкулах, прысвечаных прэм’ерам, рэцэнзіях на спектаклі, інфарма-цыі аб гастрольнай дзейнасці. Значнае месца займаюць ін-тэрв’ю з вядучымі і маладымі майстрамі сцэны, творчыя партрэты дзеячаў тэатральнага мастацтва. Разглядаюцца актуальныя праблемы сучаснай тэатральнай адукацыі, пы-танні, звязаныя з далейшым жыццём у мастацтве выпуск-нікоў творчых ВНУ краіны. Гэтым праблемам прысвечаны такія артыкулы, як: Та-раканава М. Рабі, што можаш, і хай будзе тое, што будзе! // Культура. 2004. № 31–32. [Пра дыпломны спектакль “Пастка для...” па п’есе Р. Тама ў студэнцкім тэатры БДАМ. Рэж. Д. Пусцільнік]; Панаскина Т. “Терроризм” в студенческом театре: В спектакле зрители играли заложни-ков // Веч. Минск. 2004. 18 июня.; Парадавалі выпускнікі // ЛіМ. 2004. 18 чэрв.

[Пра выпускны канцэрт навучэнцаў Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага каледжа ў На-цыянальным акадэмічным тэатры балета Рэспублікі Бела-русь]; Кабанов С. Театр – кафедра, с которой можно ска-зать людям многое / Беседовала Л. Приходько // Мин. курь-ер. 2004. 28 мая. [Пра дзейнасць студэнцкага тэатра БДАМ].
Творчасці маладога рэжысёра Нацыянальнага акадэміч-нага драматычнага тэатра імя М. Горкага П. Харланчука прысвечаны артыкулы: Детектор лжи, или Всегда ли по-лезно говорить правду? // Веч. Минск. 2004. 9 июля; Хар-ланчук П. Над зязюліным гняздом// Культура. 2004. № 38–39; Бервольд Е. Коктейль чувств // Знамя юности. 2004. 9 апр.; Харланчук П. Ён прайшоў "Дэтэктар маны" // Культура. 2004. № 22“ ;Дэтэктар” прафесіяналізму // Культура. 2004. № 15; Бойко Т. “Я приказываю любить...” // Веч. Минск. 2004. 12 апр.
Шмат водгукаў мае на старонках друкаваных дзяржаў-ных сродкаў масавай інфармацыі творчасць маладога рэ-жысёра Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы П. Адамчыкава: Барабаншчыкава В. “Вішнёвы сад” у спаль-ным вагоне // Настаўн. газ. 2004. 5 лют.; Мядзведзева В. Слоў няма, а Чэхаў ёсць // Чырв. змена. 2004. 27 лют. (Дадатак да газ. “Звязда” № 51–52); Ольгерд М. Что внутри у вишневой косточки // Знамя юности. 2004. 20 февр.; Орлова Т. Луна в спальном вагоне // Рэспубліка. 2004. 27 лют.
Вялікая ўвага надаецца ажыццяўленню новых творчых праектаў. З гэтым бокам тэатральнага жыцця можна па-знаёміцца ў публікацыях: Завадская Н. “Культпоход в те-атр” // Сов. Белоруссия. 2004. 11 дек. [Пра пастаноўку спектакля “Мастер и Маргарита” паводле М.Булгакава на сцэне Новага тэатра, створанага ў рамках Тэатра-студыі кінаакцёра маладым рэжысёрам А. Кірэевым]; Киреев О. В театре нашли Бегемота // Веч. Минск. 2004. 17 дек. [Бесе-да с режиссером Нового театра о творческих планах]; За-вадская И. Сплошная импровизация! // Сов. Белоруссия. 2004. 23 нояб. [Пра стварэнне дзіцячага тэатра “Кукушки-ны дети” на базе Нацыянальнага акадэмічнага драматыч-нага тэатра імя М. Горкага. Галоўны рэжысёр новага ка-лектыву П. Харланчук.]; Стрэл А. Цяжка здаць рэжысёр-скі экзамен // Звязда. 2004. 12 лістап. [Пра творчую дзей-насць маладого рэжысёра П. Харланчука]; Коц А. Шлях да геніяльнасці? / Гутарыла К. Пашук // Культура. 2004. 13–19 лістап. (№ 46). [Гутарка з маладым акцёрам Нацыя-нальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага пра праект “V.S.”, у рамках якога ідзе праца над спектак-лем “Три сестры” па п’есе А.Чэхава. ]; Коц О. “Три сестры” в японском стиле: все роли в спектакле по бессмертной пьесе Чехова сыграют мужчины / Беседовала Т. Бойко //

Веч. Минск. 2004. 24 нояб.
У сувязі з тым, што беларускі тэатр упэўнена ўвахо-дзіць у супольнасць еўрапейскіх тэатраў, актывізуецца фестывальны рух, асвятленне якога дастаткова поўна адбы-ваецца на старонках друку. Аналізуюцца канцэпцыі фесты-валяў, іх праблемы, дасягненні, перспектывы. У першую чаргу гэта тычыцца такіх традыцыйных мерапрыемстваў, як Міжнародны тэатральны фестываль "Белая Вежа" ў г. Брэсце, Міжнародны фестываль "Славянскія тэатраль-ныя сустрэчы", які адбываецца ў г. Гомелі, Рэспубліканскі тэатральны фестываль "Маладзечанская сакавіца". Шырокі рэзананс у прэсе атрымалі I Міжнародны фестываль сучас-нага тэатра "Адкрыты фармат", які адбыўся ў Мінску. Сярод асноўных публікацый па гэтых аспектах тэатральна-га жыцця краіны можна адзначыць наступныя: Катовіч Т. Мы людзі... Мы можам паразумецца..: Шляхі "Белай Ве-жы" // ЛіМ. 2004. 6 лют.; Александрова И. Над "Белай Ве-жай" – флаги разных континентов: Сегодня в Бресте от-крывается IX Международный театральный фестиваль "Бе-лая Вежа" // Нар. газ. 2004. 24 верас.; Архипова А. Какие флаги будут в гости к нам // Заря (Брест). 2004. 4 сент.; Архипова А. "От пяти до бесконечности..." // Заря (Брест). 2004. 18 сент.; Яскевіч С. "Анёл" і "Хуліган" збіраюцца на "Белую Вежу" // Звязда. 2004. 24 верас.; Аўдоніна Т. Рада-вые Перамогі // Мастацтва. 2004. № 7–8.; Грамыка Л.А. Яны гэта зрабілі! // Мастацтва. 2004. № 3. ["Круглы стол" па выніках Міжнароднага тэатральнага фестывалю "Ад-крыты фармат", г. Мінск]; Сарокіна Н. "Адкрыты фармат": Мінск убачыў новае // ЛіМ. 2004. 23 студз.; Грамыка Л. Панарама сезона // Мастацтва. 2004. № 2.; Щедрина О. Праздник театрального искусства // Мин. курьер. 2004. 5 мая.; Аўдоніна Т. Радавыя Перамогі // Мастацтва. 2004. № 7–8; Козак А. "Наш принцип отбора – не просто хоро-ший спектакль..." // Заря (Брест). 2004. 25 сент.
На старонках друку знайшоў сваё адлюстраванне I Між-народны фестываль тэатральнага мастацтва "Панарама", які адрозніваўся ад іншых фестываляў, што праводзяцца ў нашай краіне, сваёй канцэпцыяй – паказам апошніх дасяг-ненняў сучаснага тэатра, пачынаючы ад традыцыйных і завяршаючы авангардысцкімі пошукамі: гэты фестываль – значная з'ява ў галіне тэатральнага мастацтва, якая спрыяе стварэнню іміджу нашай краіны (Балыко Д. К че-му приводят случайные встречи: спектакль по пьесе А. Об-разцова "Все кошки серы" на фестиваль "Панорама" привез питерский театр "Комедианты" // Знамя юности. 2004.
5 нояб.; Бервольд Е. По пьеске, да по маленькой... // Зна-мя юности.

2004. 20 нояб.).
Удзелу беларускіх тэатраў у міжнародных фестывалях ін-шых краін прысвячаліся такія матэрыялы, як: Береснева О. Белорусские танцоры покоряют Кипр // Мин. курьер. 2004. 15 июля [Об участии Национального академического театра балета Республики Беларусь в Международном фестивале "Величайшие балеты мира", г. Лимассола, Кипр]; Іваноўскі Ю. Трыумф у Турцыі // Віцеб. рабочы. 2004. 5 чэрв.; Леп-шыя – акцёр і рэжысёр // Культура. 2004. № 24. [Пра ўдзел Гродзенскага абласнога тэатра лялек у VII Міжнародным фестывалі лялечнага мастацтва ў Празе]; Береснева О. Сказ-ка, я тебя знаю! // Мин. курьер. 2004. 5 июня [Пра ўдзел беларускіх тэатраў у VI Міжнародным тэлевізійна-тэатраль-ным фестывалі "Ожившая сказка" ў Маскве]; Марадудина Н. Лучшее золото – сказки // Веч. Минск. 2004. 8 июля, і шмат іншых публікацый.
Шэраг выданняў змясціў звесткі пра ўдзел Нацыяналь-нага акадэмічнага драматычнага тэатра М. Горкага ў II Між-народным тэатральным фестывалі "Золотой Витязь" у Маскве, на якім быў паказаны спектакль "Извещение Марии" па п'есе П. Кладэля ў пастаноўцы Б. Луцэнкі (га-зеты "Сов. Белоруссия" ,"Мин. курьер" і інш.).
Амаль усе сродкі масавай інфармацыі шырока асвят-лялі акцыю па ўручэнні прэмій кампаніі "Філіп Морыс" у галіне харэаграфічнага мастацтва – "Філіп Морыс дэбют" і "Жыццё ў мастацтве" балерынам К. Борчанка і І. Душке-віч, якая адбылася ў снежні 2004 г.
Прапагандзе і папулярызацыі тэатральнага мастацтва, пытанням эстэтычнага выхавання сродкамі тэатра былі прысвечаны артыкулы: "Любим театр с детства" // Веч. Минск. 2004. 24 марта; Кармазина С. Искусство быть Зри-телем // Гродзен. праўда. 2004. 18 сак. У маі 2004 г. у На-цыянальным прэс-цэнтры (г. Мінск) адбылася прэс-канфе-рэнцыя на тэму "Роля тэатральнага мастацтва ў фарміра-ванні маральных і эстэтычных ідэалаў у беларускіх гледа-чоў", пытанні якой асвятляліся ў наступных артыкулах: Барабаншчыкава В. У барацьбе з ветракамі // Настаўн. газ. 2004. 6 мая; Бервольд Е. Особенности национального зри-теля // Знамя юности. 2004. 7 мая. Пра вынікі конкурсу "Любім тэатр з дзяцінства" ў Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача гаварылася ў артыкуле: Дзянісенка К. Любім з дзяцінства // ЛіМ. 2004. 28 мая. Пытанням эстэтычнага выхавання і прапагандзе тэатральнага мастац-тва прысвечаны артыкул: Цярэшчанка М. Тэатральнае ас-ветніцтва // ЛіМ. 2004. 18 чэрв. [Пра дзейнасць грамадска-га дабрачыннага аб'яднання "Таленты і прыхільнікі", г. Мінск].

Шэраг артыкулаў быў прысвечаны стану матэрыяльна-тэхнічнай базы тэатральных устаноў: Чыгрын С. На руінах тэатра не будзе // Культура. 2004. № 22. [Аб праблеме бу-даўніцтва новага памяшкання Слонімскага беларускага дра-матычнага тэатра]. Шырока асвятляліся ў друку праблемы, звязаныя з рэканструкцыяй будынка ТА "Нацыянальны акадэмічны тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь" у артыкулах: Елізар'еў В. Дома і сцены дапамагаюць спя-ваць і танцаваць // Звязда. 2004. 20 студз.; Ахремчик Т. МЧС сказало – "надо"! // Нар. газ. 2004. 27 сак.; Денисен-ко Е. Театр начинается с… техники безопасности // Сов. Бе-лоруссия. 2004. 17 марта.; Спешите видеть!: Националь-ный академический театр оперы и балета будет закрыт на реконструкцию в следующем году. Об этом вчера заявил министр культуры Леонид Гуляко // Сов. Белоруссия. 2004. 27 марта.; Цімошык Л. "Куды? Куды? Куды сышлі вы…" любімага тэатра залатыя дні? // Звязда. 2004. 27 сак.; Ахремчик Т. Сезон надежд? // Нар. газ. 2004. 23 верас.
Не адразу беларускімі тэатральнымі крытыкамі было заўважана з'яўленне новага пакалення драматургаў, якое прыйшло ў тэатр у пачатку 1990-х гг., калі змянілася агульнапалітычная сітуацыя ў былым СССР. У рэспубліках былога Савецкага Саюза добра ведалі драматургію К. Кра-півы, К. Губарэвіча, М. Матукоўскага, А.Макаёнка, А. Дзя-лендзіка, А. Петрашкевіча. Сучасны беларускі тэатр цяжка ўявіць сабе без імя А. Дударава. Можна сказаць, што мена-віта на яго творах у значнай ступені грунтуецца тэатраль-нае жыццё рэспублікі. Як вядома, спектакль Нацыяналь-нага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы "Радавыя" адзнача-ны Дзяржаўнай прэміяй СССР, а п'еса была пастаўлена больш чым у 100 тэатрах былога СССР. (Дарэчы, на трады-цыйным Міжнародным фестывалі "Славянскія тэатральныя сустрэчы-2004", які праходзіў у Бранску (Расія), спектакль Гомельскага абласнога драматычнага тэатра "Радавыя" па п'есе А.Дударава ў пастаноўцы В. Раеўскага атрымаў га-лоўную ўзнагароду – Гран-пры. Гл. артыкулы: Грачев А. Гран-при – Рядовым // Сов. Белоруссия. 2004. 10 июня.; Команава Т. Цютчаў, Напалеон, Дзерваед і іншыя: На XII Славянскіх тэатральных сустрэчах у Бранску // Культура. 2004. № 23 і інш. З цягам часу маштаб драматургічных твораў не страціўся, хаця ў п'есах 1990-х гг. змянілася агульная інтанацыя, погляд аўтара на герояў і рэчаіснасць. Сваёй творчасцю, плённай працай драматург унёс значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры. У дзяржаўных сродках масавай інфармацыі друкаваўся шэраг артыкулаў аб творчасці драматурга: Дударев А. "Я никогда не иду у зрителей на поводу"// Сов. Белоруссия. 2004. 28 янв.; Ду-дараў А. "Тэатр – мастацтва жывое" // Чырв. змена.

2004. 10 студз. Дадатак да газ. Звязда (№ 6–7); Калина Л. И вой-на стучалась в души // Гомел. праўда. 2004. 26 чэрв. і інш.
Як у Беларусі, так і за мяжой добра вядома драматур-гія А.Паповай, якая прымае актыўны ўдзел у сучасным тэ-атральным працэсе (Попова Е. Между ярмаркой и салоном // Сов. Белоруссия. 2004. 21 февр.).
Сярод новага пакалення беларускіх драматургаў шмат самых розных індывідуальнасцяў, якія працуюць у разна-стайных як тэматычных, так і жанравых планах. Сярод яр-кіх прадстаўнікоў драматургаў новага пакалення – А. Глобус, С. Кавалёў, У. Саўліч, М. Манохін, С. Кандрашоў, П. Васючэнка, Л. Вашко, М. Рудкоўскі. Упэўнена абвясціў аб сабе малады драматург А. Курэйчык, творчасці якога быў прысвечаны шэраг публікацый: Бунцэвіч Н. "Зверскі" спектакль! // Культура. 2004. № 10; Орлова Т. А в феврале зацвёл жас-мин… // Рэспубліка. 2004. 5 сак.; Курейчик А. "То ли еще будет! " // Мин. курьер. 2004. 23 апр.; Бервольд Е. Приру-чение "Пьемонтского зверя" // Знамя юности. 2004. 14 мая.; Береснева О. "Пьемонтский зверь" – на суд минчан // Мин. курьер. 2004. 12 мая.; Завадская И. Готика механика // Сов. Белоруссия. 2004. 8 мая.; Орлова Т. Ничто не исчеза-ет, даже если жизнь иная: своей последней премьерой Республиканский театр белорусской драматургии собирает-ся потрясти Сибирь // Рэспубліка. 2004. 14 мая; Курейчик А. Откровенность за откровенность // Мин. курьер. 2004. 11 июня.; Цімошык Л. "Падпольны" фурор тэатральнага Цэнтра // Чырв. змена. 2004. 4 чэрв. Дадатак да газ. Звяз-да (№ 136–137). [Пра дзейнасць Цэнтра сучаснай драма-тургіі і рэжысуры пад кіраўніцтвам А. Курэйчыка]; Кома-нава Т. П'емонцкія жарсці // Культура. 2004. № 22.
Творчасці прадстаўнікоў маладой драматургіі былі пры-свечаны матэрыялы: Барабаншчыкава В. Сяргей Кавалёў – драматург на Парнасе // Настаўн. газ. 2004. 20 сак.; Бара-баншчыкава В. Ці то людзі, ці то багі // Настаўн. газ. 2004. 20 сак. [Аб прэм'еры спектакля "Тарас на Парнасе" па п'есе С. Кавалёва на сцэне Беларускага рэспубліканска-га тэатра юнага гледача ў пастаноўцы Н. Башавай]; Аль-шэўскі Р. Ці знаў хто, братцы, з вас Тараса… // Культура. 2004. № 15; Бервольд Е. Мистер Розыгрыш // Знамя юно-сти. 2004. 9 апр.; Разум Я. "Тарас на Парнасе" // Голас Ра-дзімы. 2004. 22 крас.; Бервольд Е. Про веселого Тараса // Знамя юности. 2004. 9 апр.; Салееў В. "Тарас на Парнасе": вопыт тэатральнай герменеўтыкі: з нагоды прэм'еры ў Рэс-публіканскім тэатры юнага гледача // ЛіМ. 2004. 30 крас.; Манохін М. Беларускі Шэкспір жыве на вёсцы // Культу-ра. 2004. № 19.
У артыкуле: Сіўчыкава А. У свеце сучасных дыялогаў // Мастацтва.

2004. № 4 ішла гаворка пра выхад кнігі "Су-часная беларуская драматургія: Традыцыі і наватарства" / Уклад. П.Васючэнка (Мн., 2003). У часопісе "Нёман) "2004. № 7) быў апублікаваны артыкул: Журавлёв В. На путях истории и теории драматургии.
Інфармацыя аб Рэспубліканскім конкурсе на стварэнне п'ес для тэатра пад дэвізам "Дзень Перамогі", прысвечана-га 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вай-не, праходзіла ў шэрагу дзяржаўных сродкаў масавай ін-фармацыі: Барабаншчыкава В. У гонар Аркадзя Куляшова // Настаўн. газ. 2004. 18 мая; Гребень И. День Победы драматургов // Знамя юности. 2004. 14 мая.; Щедрина О. До главных премий не дотянули // Мин. курьер. 2004. 4 мая.  і інш.
На старонках дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі разгледжваліся вынікі тэатральнага сезона: восем па дзеся-цібальнай / В. Марцецкі, А. Калюнава, А. Карэлін, С. Ка-вальчык, А. Курэйчык, А. Грышына; падрыхтавалі Т. Ко-манава, Р. Альшэўскі // Культура. 2004. № 33; асвятля-ліся новыя формы дзейнасці тэатральных калектываў, у т.л. прыватных антрэпрыз: "Виртуозы сцены" пад кіраў-ніцтвам У. Ушакова; "Белорусские сезоны" пад кіраўніцт-вам Я. Валабоева; "Никола-театр", у якім ставіць свае спек-таклі М. Пінігін; стварэнне новага Сучаснага мастацкага тэ-атра пад кіраўніцтвам У. Ушакова ў Мінску; дзейнасць пра-дзюсерскіх цэнтраў "Альфа-Радыё" ,"Малый театр" і інш.
У дзяржаўным друку разглядаліся розныя аспекты дзей-насці Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы: Мешчаракова В. "Бывайце здаровы, жадаем вам шчасця" // ЛіМ. 2004. 17 снеж. [З гісторыі тэтра]; Давыдзька Г. Тэатр – і ўсё жыццё, або Падарункі з-за спіны // ЛіМ. 2004. 3 снеж. [Гутарка з дырэктарам тэатра пра творчасць]; Дзятліковіч К. "Королев я не играю": к 85-летию со дня рождения актрисы Г. Макаровой. // Во славу Родины. 2004. 28 дек.; Орлова Т. Геннадий Гарбук. Знак судьбы. Продолжение... // На экранах. 2004. № 10.
Значны рэзананс мела на старонках друку прэм'ера спектакля "Земляничная поляна" па сцэнарыю знакамітага шведскага рэжысера І. Бергмана, якая адбылася на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага. Пастаноўку спектакля ажыццявіў вядомы ра-сійскі рэжысёр А. Кац (г. Масква), галоўную ролю сыграў народны артыст СССР Р. Янкоўскі, да 75-годдзя якога і быў пастаўлены спектакль. Сярод публікацый: Альшэўскі Р. Назад да Бергмана! // Знамя юности. 2004. 12 нояб.; Пепеляев В. Горький вкус земляники // Сов.

Белоруссия. 2004. 16 нояб.; Селядкова Г. Чаканыя простыя словы // ЛіМ. 2004. 24 снеж.; Пашук К. Зазірнуць унутр сябе: у Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя М. Горкага паставілі "Сунічную паляну" // Настаўн. газ. 2004. 2 снеж.

Аб прэм'еры спектакля "Опера нищих" па п'есе Б. Брэх-та на сцэне Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў пастаноўцы мастацкага кіраўніка Б. Луцэнкі гаварылася ў артыкулах: Завадская И. Сыграем "на интерес" // Сов. Белоруссия. 2004. 31 дек.; Таццянчык У. Пераднавагодняя прэм'ера // Звязда. 2004. 31 снеж.

На старонках друку дастаткова шырока асвятлялася дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэат-ра імя Я. Коласа: Малей А. Партрэт мастака з Музай і Смер-цю // Настаўн. газ. 2004. 1 лістап. [Аб спектаклях па тво-рах драматурга У. Драздова "Шагал... Шагал..." ,"Мадам Боншанс" і "Ружа ў чыстым полі", пастаўленых галоўным рэжысёрам В. Баркоўскім; Савва В. Отцы и дети XXI века // Нёман. 2004. №10. С. 193–202. [Пра спектакль па п'есе У. Астрава "І нас пацалуе світанак"] і інш. Значная коль-касць артыкулаў была прысвечана дзейнасці абласных тэ-атраў.

Шэраг матэрыялаў прысвячаўся 65-годдзю Гомельскага абласнога драматычнага тэатра: Сидорчик В. Театр начина-ется с актера // 7 дней. 2004. 9 дек.; Данилкова О. Област-ной театр – на раённых подмостках // Гомел. праўда. 2004. 7 снеж.; Клыга А. Сквозь слезы и радость к вере и надежде // Гомел. праўда. 2004. 18 снеж. Найшла сваё пэў-нае адлюстраванне на старонках друку і дзейнасць Дзяр-жаўнага маладзёжнага тэатра, які адзначыў сваё 20-годдзе: Береснева О. Театр молодых сердец // Мин. курьер. 2004. 17 нояб.; Васанская Ж. Без грима. // Сов. Белоруссия. 2004. 6 нояб.; Панаскина Т. Молодежный театр не дремлет // Веч. Минск. 2004. 17 нояб., і шэраг іншых публікацый.

У галіне музычнага тэатра вялікі рэзананс на старон-ках друку мела прэм'ера рок-оперы-балета "Арфей і Эўры-дыка" кампазітара А. Журбіна ў пастаноўцы К. Шмарго-нэра, якая адбылася на сцэне Дзяржаўнага музычнага тэ-атра РБ. Пастаноўшчыкі прадставілі абсалютна новую, арыгінальную версію вядомай рок-оперы, злучыўшы ў спектаклі жывы аркестр, вакал і харэаграфію. А. Журбін адзначыў, што тэатр пайшоў на вялікі рыск, калі вырашыў ажыццявіць такі незвычайны эксперымент, і патрэбен час для таго, каб асэнсаваць здабыткі і недахопы такой паста-ноўкі. Можна адзначыць асноўныя рэцэнзіі на гэты спек-такль, сярод якіх: Бунцэвіч Н. Такая старая гісторыя... // Культура. 2004. № 45.; Ахремчик Т. Старая, старая рок-сказка // Нар. газ. 2004. 9 лістап.; Бервольд Е. "Орфей полюбил

Эвридику! Какая старая история…” // Знамя юности. 2004. 12 нояб. Таксама былі артыкулы ў газетах “Во славу Родины“ ,”Минский курьер”, “Вечерний Минск“ ,”Настаўніцкая газета” і інш.
Карціна адлюстравання на старонках друку стану і праб-лем ***музейнага жыцця*** выглядае наступным чынам: звыш 55% ад агульнай колькасці ўсіх публікацый па розных аспектах музейнай дзейнасці займаюць матэрыялы, пры-свечаныя экспазіцыйнай і выставачнай рабоце музеяў. Гэта могуць быць матэрыялы кароткага інфармацыйнага зместу і публікацыі-агляды аб новых экспазіцыях. Пры арганіза-цыі і правядзенні міжнародных выставак у тым або іншым музеі колькасць такіх публікацый інтэнсіўна ўзрастае. Так, напрыклад, самыя шырокія пазітыўныя водгукі ў друку мелі наступныя міжнародныя выстаўкі, якія прай-шлі на пачатку 2004 г.: выстаўка твораў М. Дабужынскага ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь з фондаў Музея тэатра, музыкі і кіно Літвы і “Сучасная кі-тайская акварэль” у Нацыянальным музеі гісторыі і куль-туры Беларусі. З 16 чэрвеня па 1 ліпеня ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь экспанавалася вы-стаўка “Жорж Санд і яе стагоддзе”, прымеркаваная да 200-годдзя з дня нараджэння французскай пісьменніцы. Арганізатарам яе выступіла Пасольства Францыі ў Рэспуб-ліцы Беларусь. З 6 ліпеня па

12 верасня ў гэтым жа музеі экспанавалася выстаўка “Марк Шагал і сцэна” з калекцыі ўнучкі мастака Мэрэт Меер-Грабер, на якой былі прадстаў-лены эскізы тэатральных дэкарацый і касцюмаў. У гэты ж час Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі пры-маў у сябе выстаўку “Залаты век маёлікі” Нацыянальнай галерэі антычнага мастацтва ў Рыме, на якой экспанавала-ся каля 300 мастацкіх твораў керамікі (маёліка эпохі Ад-раджэння, перыяду XVII–XVIII стст.). прэса не абыйшла ўвагай і выстаўку “Цудоўная краіна Астрыд Ліндгрэн”, якая была адкрыта ў рамках Дзён культуры Швецыі ў Рэс-публіцы Беларусь у Нацыянальным музеі гісторыі і куль-туры Беларусі. Шырокі рэзананс у друку мелі і падзеі, звя-заныя з дэманстрацыяй у Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь персанальнай выстаўкі А. Шылава, выстаўкі Марціроса Сар’яна. 6 снежня ў гэтым жа музеі пры садзейнічанні Пасольства Японіі ў Рэспубліцы Бела-русь адкрылася унікальная выстаўка “Традыцыйная япон-ская кераміка”. Належна была прадстаўлена на старонках друку і выстаўка Дзяржаўнага літаратурнага музея Я. Купалы “Йшла доля беларуса з доляй украінца”, якая напачатку экспанавалася ў Нацыянальным музеі Т. Шаўчэнкі ў Кіе-ве, а затым у Купалавым доме. Яна была прымеркавана да 190-годдзя з дня нараджэння Т. Шаўчэнкі.

Шматлікія пазітыўныя водгукі прэсы мелі выстаўкі, ство-раныя ў выніку супрацоўніцтва музеяў рэспублікі. Гэта выстаў-ка “Вобраз Маці Божай у іканапісе” з фондаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі і выстаўка “Марк Шагал і мастакі еўрапейскага авангарда” з фондаў Музея М. Шагала ў Віцебску, якая экспанавалася ў залах Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, а затым у Магілёўскім музеі В.К. Бялыніц-кага-Бірулі.

Неабходна падкрэсліць, што экспазіцыйная і выставач-ная работа музеяў у 2004 г. была як ніколі раней актыві-завана і па прычыне належнай падрыхтоўкі да 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Мазаічны характар паведамленняў СМІ не дазваляе скласці поўную карціну выставачнай дзейнасці ўсіх музеяў падчас святкавання гэтых знамянальных дат. Прывядзём толькі некаторыя факты па публікацыях за чэрвень-ліпень: у На-цыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адкры-лася выстаўка “Красуй, Беларусь”; у Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў рамках Рэспублікан-скай мастацкай выстаўкі “Калі музы гавораць…” адкры-лася экспазіцыя “Мы помнім кожнага салдата…”; у Дзяр-жаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа – выстаўка “У цяжкі час

вайны суровай...”; у Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры – “Доўгія вёрсты вай-ны...”; у Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі – “Памяць пра вайну”, у Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі – “Быў месяц ліпень”; у Музеі Беларускага Палесся – “Піншчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны” і “Памяць”; у Музеі гісторыі горада Светлагорска – “Гэты дзень мы набліжалі як маглі”, і шэраг іншых.

Газета “Звязда” на старонках свайго дадатку “Саюзнае веча” змясціла інфармацыю пра адкрыццё 23 чэрвеня 2004 г. у Маскве, у Цэнтральным музеі Вялікай Айчыннай вайны на Паклоннай гары выстаўкі “Гром над Палессем”, прысве-чанай 60-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысц-кіх захопнікаў. Выстаўка была арганізавана пры актыў-ным удзеле Пасольства Беларусі ў Расіі і нацыянальна-культурнай аўтаноміі “Беларусы Масквы”.

Але, мабыць, найбольшы рэзананс у прэсе набыла вы-стаўка “Шэдэўры Нацыянальнага мастацкага музея Рэс-публікі Беларусь”, якая 25 мая 2004 г. была ўрачыста ад-крыта ў Маскве ў Траццякоўскай галерэі. Шматлікія орга-ны друку адзначылі на сваіх старонках, што падрыхта-ваная для паказу ў Маскве экспазіцыя атрымалася уні-кальнай і па колькасці, і па якасці твораў. На ёй былі прад-стаўлены лепшыя старажытнабеларускія абразы і скульп-туры, больш за 40 выдатных твораў рускага мастацтва, каля 40 карцін класікаў беларускага жывапісу ХХ ст. За апошнія 10 гадоў беларускія мастацкія зборы яшчэ не былі настолькі багата і разнастайна паказаны ў Расіі. Гэта вы-стаўка стала самай маштабнай з усіх, якія калі-небудзь прадстаўлялі Беларусь за межамі краіны. Выстаўка “Шэ-дэўры Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Бела-русь”, прысвечаная 65-годдзю з дня заснавання музея, – адказ на сяброўскія і дзелавыя стасункі, што склаліся па-між буйнейшымі музеямі дзвюх краін. Яна адбылася ў ме-жах Года культуры Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэ-рацыі.

Другую па аб’ёму групу публікацый складаюць матэ-рыялы аб непасрэднай дзейнасці таго або іншага музея на сучасным этапе (ад 26% да 30%) Перш за ўсё гэта юбілей-ныя матэрыялы. У гэтых публікацыях – гісторыя музея, сучасны стан, набалелыя праблемы, іншым часам – вопыт. Увесь 2004 г. для Нацыянальнага мастацкага музея Рэс-публікі Беларусь праходзіў пад знакам юбілею – 65-годдзя з часу заснавання музея. З гэтай нагоды – шматлікія арты-кулы і інтэрв’ю ў друку дырэктара музея У. Пракапцова, навуковых супрацоўнікаў музея, артыкулы журналістаў.

Не абдзелены былі ўвагай прэсы і Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай

Айчыннай вайны з нагоды 60-годдзя свайго адкрыцця, Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Я. Коласа з нагоды 45-годдзя з часу адкрыцця. У 2004 г. споўнілася 25 год Музею старажытнабеларускай культуры ІМЭФ НАН Беларусі, 35 год Музею Міная Шмы-рова, 15 год музею “Выратаваныя музейныя каштоўнасці ,”85 год Гомельскаму абласному краязнаўчаму музею, 75 год Баранавіцкаму краязнаўчаму музею.
На сучасным этапе музеі Беларусі перажываюць пэўнае рэфармаванне сваёй дзейнасці: ствараюцца новыя пастаян-ныя экспазіцыі, укараняюцца новыя інфармацыйныя тэх-налогіі і г.д. 7 ліпеня 2004 г. на пасяджэнні калегіі Міні-стэрства культуры Рэспублікі Беларусь абмяркоўваліся пы-танні сучаснага стану музеяў рэспублікі і была прынята канцэпцыя развіцця музейнай справы ў Рэспубліцы Бела-русь да 2010 г. Інфармацыю аб гэтай падзеі апублікавала толькі газета “Культура” (№ 33). На старонках прэсы не атрымаўся і працяг размовы аб набалелых праблемах му-зеяў, аб перспектывах іх развіцця ў святле напрамкаў дзейнасці, вызначаных канцэпцыяй.
Неабходна адзначыць, што вельмі належна і актыўна прэса асвятляе пазітыўныя факты ў жыцці музейнай су-польнасці. На старонках шматлікіх рэспубліканскіх, аблас-ных, гарадскіх газет шырокі водгук меў факт адкрыцця 18 мая 2004 г. другога корпусу Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі па вул. Фрунзе, 19, прымеркаваны да Міжнароднага дня музеяў. Да адкрыцця гэтага будынка, перададзенага музею па распараджэнні Прэзідэнта краіны А. Лукашэнкі, было прымеркавана і адкрыццё першай экспазіцыі “Праз далячынь стагоддзяў”.
Менавіта такі ж значны грамадскі рэзананс мела і ін-фармацыя пра адкрыццё новых музеяў. У 2004 г. у складзе Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка быў адкрыты Дзіцячы музей, у складзе Заслаў-скага гісторыка-культурнага музея-запаведніка быў адкры-ты музей-дот, адкрыўся Крупскі гісторыка-краязнаўчы му-зей, Музей ваеннай тэхнікі пад адкрытым небам каля Кургана Славы. 2 ліпеня 2004 г. у Гомелі адбылася ўрачы-стая цырымонія адкрыцця Музея ваеннай гісторыі – філія-ла Гомельскага абласнога краязнаўчага музея; На Любан-шчыне быў адкрыты Музей традыцыйных рамёстваў і про-мыслаў – філіял мясцовага Дзяржаўнага музея народнай славы. 18 чэрвеня ў в. Бычкі Ушацкага раёна адбылося ад-крыццё музея-сядзібы В. Быкава – філіяла Ушацкага музея народнай славы імя У.Е. Лабанка, ва ўрочышчы Мерачоў-шчына – музея-сядзібы Т. Касцюшкі. У мемарыяльным комп-лексе “Хатынь” функцыянуе новы экскурсійны

аб’ект – музей пад назвай «Фотадакументальная экспазіцыя “Ха-тынь”».
Знаёміць прэса з ходам работ па стварэнню Музея гісторыі Мінска (Мин. курьер. 2004. 28 февр.), гісторыка-краязнаўчага музея ў Лагойску, гісторыка-краязнаўчага музея ў Слаўгарадзе (Могилев. ведомости. 2004. 6 апр.).
Неабходна адзначыць, што на старонках друку неадна-разова падымаліся пытанні пра неабходнасць стварэння ў Мінску музея народнага мастацтва (Настаўн. газ. 2004.
6 крас.), агульнанацыянальнага спартыўнага музея (Культура. 2004. № 3), музея аўтамабільнага транспарту (Культура. 2004. № 12, 13, 22).
У 2004 г. на грамадскіх пачатках адкрыліся: Музей памяці ахвяраў канцэнтрацыйных лагераў у пасёлку Аза-рычы Калінкавіцкага раёна; Музей Бабруйскай крэпасці, створаны ў гарадской бібліятэцы Бабруйска; у в.Тамашоў-ка Брэсцкага раёна, дзе нарадзіўся двойчы Герой Савецка-га Саюза касманаўт П. Клімук, узнавіў работу пасля рэкан-струкцыі будынка музей касманаўтыкі.
У Мінску па вуліцы Прытыцкага, 10 адкрыўся прыват-ны музей-галерэя “Свет Фота”.

***Ахова і адраджэнне гісторыка-культурнай спадчыны*** з’яўляецца адным з прыярытэтных напрамкаў у развіцці нацыянальнай культуры. Аналіз публікацый па гэтай тэ-матыцы дазваляе зрабіць наступным вывад: усе без выклю-чэння друкаваныя СМІ сур'ёзна ўключаны ў сферу прапа-ганды нацыянальнай спадчыны, назіраецца актывізацыя яе папулярызацыі: публікуецца інфармацыя не толькі аб шырока разрэкламаваных помніках, але і аб малавядомых.
Па прыблізных падліках гэта група матэрыялаў з’яўля-ецца самай шматлікай – звыш 50% ад усіх публікацый па тэматыцы гэтай галіны культуры. Адметная асаблівасць гэтага тыпу публікацый апошняга часу заключаецца ў тым, што расказ пра стварэнне таго альбо іншага помніка, яго знакавасць і месца ў гісторыі беларускай культуры су-праваджаецца, як правіла, прапановамі аб магчымым вы-карыстанні іх у сферы культурнага турызму.
Стала нормай публікацыя своеасаблівых рэпартажаў спецыялістаў аб ходзе рэстаўрацыі аб'ектаў, якія ў апошні час знаходзяцца ў полі павышанай увагі з боку грамадскас-ці і ўлад: Мірскага замка (ЛіМ. 2004. 11 чэрв.; Голас Ра-дзімы. 2004. 17 чэрв.; Труд в Беларуси. 2004. № 45; Звяз-да. 2004. 25 жн.; Культура. 2004. № 48; Бел. час. 2004.
№ 42), палацавага комплексу ў Нясвіжы (Обозреватель. 2004. 29 окт.; Культура. 2004. № 48; Туризм и отдых. 2004. № 39) і інш.

Належная ўвага ў перыядычным друку ўдзялялася ін-фармацыі і аб ходзе рэканструкцыі памятных месц і мема-рыялаў: Хатыні (Нар. газ. 2004. 5 чэрв.; Рэспубліка. 2004. 7 ліп.; Нар. газ. 2004. 1 ліп.; Культура. 2004. № 27), Кур-гана Славы (Нар. газ. 2004. 15 чэрв.; Знамя юности. 2004. 18 июня; Культура. 2004. № 27) і іншых, – у перыяд пад-рыхтоўкі да святкавання 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (з сакавіка па ліпень 2004 г.).
Увазе шырокай аўдыторыі друкаваныя СМІ прадстаў-лялі інфармацыю і афіцыйнага характару, якая потым пасля абнародавання выклікала шырокую хвалю пазітыў-нага і негатыўнага абмеркавання і дыскусій. Так адбылося, напрыклад, пасля апублікавання Указа Прэзідэнта краіны ад 14 ліпеня 2004 г. № 330 "Аб развіцці гістарычнага цэнт-ра Мінска" (Звязда. 2004. 16 ліп.; Сов. Белоруссия 2004. 17 июля). Па сённяшні дзень павышанай увагай карыста-ецца тэма беражлівых адносін да праблем адраджэння гіс-тарычычнай часткі Мінска і яна – адна з прыярытэтных для многіх сродкаў масавай інфармацыі (Мин. курьер. 2004. 22 июля; Туризм и отдых. 2004. № 11; Рэспубліка 2004. 3 жн.; Нар. газ. 2004. 28 ліп.; Веч. Минск. 2004. 9, 15 окт.; Культура . 2004. № 40 і інш.).
Сярод найбольш вострых праблем, якія неаднаразова падымаюцца спецыялістамі для абмеркавання і знаходзяць адлюстраванне на старонках друку, – захаванне і ўлік археалагічнай спадчыны, дзейнасць “чорных” археолагаў, рэстытуцыя аб’ектаў культурнай спадчыны (Нар воля. 2004. 4 чэрв.), рэстаўрацыя гістарычнага цэнтра Мінска (Культура. 2004. № 40; Нар. газ. 2004. 28 ліп.; Рэспубліка. 2004. 3 жн.; Веч. Минск. 2004. 15 окт. і інш.), аднаўленне Аўгустоўскага канала (Рэспубліка. 2004. 19 лют.; Гродзен. праўда. 2004. 25 сак.; Звязда. 2004. 22 крас.; Бел. нива. 2004. 8 апр.; Звязда. 2004. 14 кастр.; Туризм и отдых. 2004. № 46 і інш.), развіццё культурнага турызму з выка-рыстаннем гісторыка-культурнай спадчыны (Звязда. 2004. 21 мая; Обозреватель. 2004. 30 мая; 7 дней. 2004. 4 нояб.; Звязда. 2004. 14 кастр. і інш.).
Трэба адзначыць, што сярод дзяржаўных органаў дру-ку лідэрамі па колькасці апублікаваных матэрыялаў па тэ-матыцы аховы і адраджэння гісторыка-культурнай спадчы-ны з’яўляюцца газеты “Культура” і “Советская Белорус-сия”, потым – “Звязда” і “Рэспубліка”. Астатнія выданні (рэспубліканскія, абласныя і гарадскія) выглядаюць больш сціпла ў параўнанні з вышэйназванымі.

Асвятленне падзей і праблем ***у галіне выяўленчага мас-тацтва*** на старонках перыядычнага друку выглядае наступ-ным чынам: 35–40% ад

агульнай колькасці публікацый па выяўленчаму мастацтву займаюць матэрыялы, прысвеча-ныя творчасці майстроў выяўленчага мастацтва: творчыя партрэты мастакоў з нагоды іх юбілеяў або адкрыцця іх персанальных выставак і г.д. Другая група матэрыялаў прысвечана выставачнай дзейнасці. У рамках святкавання 60-годдзя вызвалення Беларусі па ўсёй краіне прайшлі сот-ні мастацкіх выставак, у тым ліку буйная рэспубліканская “Калі музы гавораць...”. Найбольшую колькасць водгукаў у прэсе, як звычайна, маюць міжнародныя выстаўкі. Сён-ня шэраг газет маюць спецыяльныя старонкі з анонсамі выставак у музеях, галерэях. Газета “Культура” вядзе спе-цыяльную рубрыку “Мастыхін”, дзе падаецца штотыднёвая інфармацыя аб новых выстаўках Мінска і рэгіёнаў.

З павышанай увагай у друку асвятляюцца інавацый-ныя культурныя акцыі. Тут варта, напрыклад, нагадаць, што ў 2004 г. двойчы ў Мінску праводзіліся аўкцыёны ан-тыкварна-аўкцыённым домам “Paragis”. Аўкцыён – новая з’ява на мастацкай арэне Беларусі, і таму цікавасць да іх правядзення была павышанай, перш за ўсё з боку журна-лістаў (Рэспубліка 2004. 11 лют.; Веч. Минск. 2004. 23 мар-та; 5 апр.; 28 окт.; Сов. Белоруссия. 2004. 18 марта; 4 апр.; 29 окт.; 7 апр.; Во славу Родины. 2004. 27 марта; 22 апр.; Звязда. 2004. 8 крас., 16 лістап.; 29 кастр.; Труд в Белару-си. 2004. № 59, 64; Нар. газ. 2004. 23 сак., 13 крас.; Комс. правда в Беларуси. 2004. 3 апр.; 16 ноября; Бел. рынок. 2004. № 11; Бел. газ. 2004. 15 марта; 1 ноября; Нар. воля. 2004. 20 сак.; 11 лістап.; Мастацтва. 2004. № 4). Як адзна-чалася ў друку, і ў першым, і ў другім выпадку было пра-дадзена 25% лотаў, таму, на думку аўтараў рэпартажных артыкулаў, цывілізаваны арт-рынак у Беларусі пакрысе фарміруецца.

Заўсёды актыўна асвятляюцца ў друку і такія падзеі, як адкрыццё новых помнікаў, мемарыяльных дошак і г. д. З удзелам Прэзідэнта сёлета ў чэрвені быў адкрыты мема-рыял “Загінуўшым, але непераможаным воінам Беларус-кай пагранічнай акругі” ў Гродне. Адбылося ўрачыстае ад-крыццё ў Гомелі помніка Кірылу Тураўскаму і помніка Та-расу Шаўчэнку. Усталяваны мемарыяльныя дошкі У. Му-лявіну, У. Вуячычу, Ф. Рушчыцу, П. Кармуніну, В. Лебе-дзеву, П. Масленікаву. Прыходзіцца падкрэсліць, што ўсе гэтыя падзеі добрасумленна, з адценнем нейтральнай абыя-кавасці адлюстроўваюцца на старонках нашага друку. Па словах Н.Шаранговіч, “...мастацкае жыццё краіны не вы-значаецца рэзкімі паваротамі і зменамі. Спробы выклікаць значны грамадскі інтарэс у апошнія гады не даюць вызна-чальных вынікаў. Не становяцца ўжо падзеямі міжнарод-ныя мастакоўскія пленэры, не спрачаецца публіка вакол новых праектаў і значных помнікаў. Дыскусіі

і дыспуты па пытаннях культуры, на жаль, згубілі сваю актуальнасць і вастрыню на пераломе стагоддзяў” (Мастацтва, 2004, № 4).
Аналіз тэматыкі публікацый, прысвечаных ***беларуска-му кінематографу,*** дазваляе зрабіць выснову аб дастаткова шырокім і шматаспектным адлюстраванні праблем гэтай сферы мастацтва ў рэспубліканскім друку.
Агульная колькасць публікацый, прысвечаных пытан-ням кіна- і відэамастацтва ў Рэспубліцы Беларусь, за ана-лізуемы перыяд складае звыш 420 артыкулаў у дзяржаў-ным і недзяржаўным друку. Найбольш поўна дадзеная тэ-ма прадстаўлена ў газетах “Культура“ ,”Народная газета“ , ”Советская Белоруссия“ ,”Звязда“ ,”Рэспубліка“ ,”Вечерний Минск”.
Вялікая ўвага надавалася пытанням арганізацыі і пра-вядзення кінафестываляў у нашай краіне, а таксама ўдзелу беларускіх кінематаграфістаў у міжнародных кінафорумах, сярод якіх асаблівае месца займае Мінскі Міжнародны фес-тываль “Лістапад”, які, нягледзячы на свой малады ўзрост ужо пераўтварыўся з месца сустрэч кінематаграфістаў СНД і Балтыі ва ўнікальны міжнародны кінафорум. З кожным годам фестываль набірае моц, становіцца больш прымет-ным і прэстыжным, дазваляе не толькі ўбачыць і зразу-мець, чым жыве сучасны кінематограф, але і вызначыць у ім месца беларускага кіно.
Найбольш поўна фестывальныя падзеі асвятляліся ў наступных артыкулах: Нячай В. “Крыш-тальны бусел”: Pro et contra: Нататкі пра IV Нацыянальны фестываль беларускіх фільмаў // Мастацтва. 2004. N 2. С. 10–11; Алёхіна Н. “Крыштальныя буслы” разляцеліся па свету // Настаўніцкая газета. 2004. 16 лістап.; Куклов В. Чистое экологическое кино // Народная газета. – 2004. – 16 крас. – С. 10; Барабаншчыкава В. Жыць у гармоніі: 23–24 красавіка ў Мінску прайшоў II Міжнародны фестываль экалагічнага кіно “EKAFILM” // Настаўніцкая газета. – 2004. – 27 крас.; Захарава В. “Анімаёўка” – у верасні // Звязда. – 2004. – 15 верас.; Свирко И. “Анимаевка-2004” // Рэспубліка. – 2004. – 15 верас. С. 3; Свирко И. Растем!: “Лістапад” признан лучшим кинофестивалем на постсовет-ском пространстве // Рэспубліка. 2004. 30 лістап. С. 3; Сцяпанава В. Зорная палітра “Лістапада” // Культура. 2004. 20–26 лістап. (N 47). С. 3; Свирко И. Праздник дет-ского кино: “Лістападзіку” уже шесть лет, он подрос и за-глядывает на взрослый экран // Рэспубліка. 2004. 18 лістап. С. 4; Шурховецкий В. В Минске – осень. И “Лістапад” // Во славу Родины. – 2004. – 23 нояб.; Пепеляев В. Смотри-те – настоящий “Лістапад”! // Советская Белоруссия. 2004. 13 нояб. С. 1, 3; Кураш В. Мінскі фестываль, які робіць Мінск фестывальным //

Культура. 2004. 20–26 лістап. (N 47). С. 4; Ахремчик Т. Влюбленные в кинематограф встречаются на “Лістападзе” // Народная газета. 2004. 23 лістап.; Крят Д. “Лістапад”: вверх по фестивальной лестнице: Президент открыл XI Минский Международный кинофестиваль “Лістапад-2004” // Советская Белоруссия. 2004. 23 нояб. С. 2.
XI Мінскі Міжнародны кінафестываль “Лістапад-2004” праходзіў пад знакам 60-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 80-гадовага юбілею бела-рускага кінематографа.
У конкурсную праграму ўвайшлі 16 карцін з розных краін свету, многія з якіх ужо адзначаны на іншых прэ-стыжных кінафорумах. Галоўны прыз “Золата Лістапада” атрымаў фільм П. Чухрая “Вадзіцель для Веры” (Расія), уладальнікамі “серабра” і “бронзы” сталі карціны “Свае” Д. Месхіева (Расія) і “Прафесіянал” Д. Кавачэвіча (Сербія). Беларускі фільм “Дунечка” А. Яфрэмава ўзнагароджаны спецыяльным прызам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За гуманізм і духоўнасць у кіно”. На старонках газет апублі-кавана больш за 70 артыкулаў, у якіх падрабязна асвятля-лася праграма і ход фестывалю 2004 г.
Кінафестывалю “Лістапад-2004” і 80-гадоваму юбілею беларускага кіно цалкам прысвечаны спецыяльны выпуск газеты “Культура” (N 47) – больш за 20 артыкулаў.
У гэтым годзе побач з “Лістападам” даволі шырока асвятляўся VI фестываль дзіцячых і юнацкіх фільмаў “Ліс-тападзік-2004”. Пераможцам сярод паўнаметражных дзіця-чых фільмаў стала стужка “Патрапаныя львы” амерыкан-скага рэжысёра Ціма МакКэнліса. Лепшым мультыпліка-цыйным фільмам названа карціна І. Кадзюковай “Легенда пра ледзі Гадзіву” (Беларусь), а пераможцам у намінацыі “лепшы дэбют” быў прызнаны мультыплікацыйны фільм Н. Хаткевіч “Бегла мышаня па траве” (Беларусь).
Дастаткова поўна ў перыядычным друку асвятляўся ўдзел беларускіх кінематаграфістаў у іншых конкурсах і фестывалях, што адбыліся на тэрыторыі Беларусі і за яе межамі. Інфармацыя пра найбольш значныя дасягненні на-шых кінематаграфістаў змешчана ў наступных артыкулах: Цяльцеўская Ю. Парыжская перамога Віктара Аслюка // Народная воля. 2004. 20 сак.; Аслюк В. “Я снимаю просто кино...” // Рэспубліка. 2004. 9 крас. С. 3“ ;Анастасію Слуцкую” вітае... Х’юстан // Культура. 2004. 17–23 крас. (N 16). С. 2; Бегун Н. Анастасия Слуцкая улетела в Хью-стон // Минский курьер. 2004. 17 апр. С. 3; Мехтиев А. “Золотой Витязь” собирает друзей // Вечерний Минск. 2004. 18 мая; Занковец А. Душа “Золотого Витязя” // Знамя юности. 2004. 28 мая. С. 19; Цяльцеўская Ю. Галіна Адамовіч атрымала Гран-пры // Народная воля. 2004.

7 мая; Міхлееў Д. Гран-пры Галіны Адамовіч // ЛіМ. 2004. 18 чэрв. С. 10; Серебряная Ю. Приз для “Дунечки” // Народная газета. 2004. 15 верас.; Піменаў І. Тры ўзнага-роды ў беларускага фільма “Бальная сукенка” // Звязда. 2004. 22 ліп.

Узнагароды, якія атрымліваюць нашы кінематаграфіс-ты на кінафорумах разнастайнага рангу, у тым ліку і на прэстыжных міжнародных кінафестывалях, сведчаць аб высокім творчым патэнцыяле нацыянальнага кінамастацт-ва. Так, фільм В. Аслюка стаў пераможцам у намінацыі “Лепшы кароткаметражны фільм” на фестывалі “Рэальнае кіно” (г. Парыж, Францыя); Г. Адамовіч атрымала Гран-пры III Міжнароднага фестывалю дакументальных фільмаў “Хранограф” за стужку “Працяг” (г. Кішынёў, Малдова); фільм “Анастасія Слуцкая” (рэж. Ю. Елхаў) быў узнагаро-джаны плацінавым дыпломам у намінацыі “Прыгодніцкі фільм” на Сусветным кінафестывалі (Хьюстан, ЗША); з по-спехам прайшоў паказ дакументальнага фільма Н. Васюк “Дэльфінёнак” на Х Міжнародным кінафестывалі ў Слава-кіі; мастацкі фільм А. Кудзіненкі “Акупацыя. Містэрыі” прыняў удзел у XXVI Маскоўскім міжнародным кінафес-тывалі; у конкурснай праграме XIII Адкрытага фестывалю кіно СНД і краін Балтыі “Кінашок” прыняў удзел фільм А. Яфрэмава “Дунечка”, таксама у конкурсе “Шорт-Шок”, які праводзіўся ў рамках “Кінашока”, былі паказаны ка-роткаметражная стужка “Вайна” (рэж. Д. Лось) і дакумен-тальны фільм “Шахта” (рэж. В. Аслюк); фільмы “Дунечка” (рэж А. Яфрэмаў) і “Вам – заданне”, зняты рэжысёрам Ю. Бяржыцкім паводле аднайменнага рамана М. Чаргінца і прадстаўлены на суд гледачоў у праграме XI Мінскага Міжнароднага фестылю “Лістапад-2004”. Творчасць нашых кінематаграфістаў не засталася без увагі на VII Міжнарод-ным фестывалі анімацыйных фільмаў “Анімаёўка-2004”,
II Міжнародным фестывалі экалагічнага кіно “EKAFILM”, XII Міжнародным дзіцячым кінафестывалі “Артэк”, II Мас-коўскім фестывалі айчыннага кіно “Маскоўская прэм’ера”, VII Міжнародным фестывалі “Брыганціна”, XIII Міжнарод-ным кінафестывалі “Залаты Віцязь” (г. Іркуцк, Расія), фес-тывалі Еўраазіяцкага кіно “Новае кіно. XXI стагоддзе”. Малады рэжысёр М. Субоцін узяў удзел у міжнародным праекце “Лагер талентаў”, арганізаваны па ініцыятыве Берлінскага міжнароднага фестывалю, дзе на працягу 7-мі дзён удзельнікі “Берлінале” праводзілі майстар-класы і семінары для 540 чалавек з усяго свету.

Знакавай для беларускага кінематографа была і заста-ецца тэма Вялікай Айчыннай вайны. Да 60-годдзя вызва-лення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на На-цыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм” завяршыліся здым-кі мастацкіх фільмаў: “На безыменнай вышыні” (рэж. В. Нікіфараў), прэм’ера якога адбылася 8–9 мая на Пер-шым нацыянальным тэлеканале; “Яшчэ пра вайну” (рэж. П. Крывастаненка) і “Вам – заданне” (рэж. Ю. Бяржыцкі) паказаны ў пазаконкурснай і конкурснай праграме XI Мін-скага Міжнароднага кінафестывалю “Лістапад-2004”.
Шэраг артыкулаў быў прысвечаны праблемам і развіц-цю беларускай анімацыі, якая ў мінулым годдзе адзначыла сваё 30-годдзе. На старонках газет уздымаліся і абмяркоў-валіся пытанні, якія найбольш востра паўстаюць перад беларускімі мультыплікатарамі.
У артыкуле Г. Ануфрыева “Анимация – процесс интим-ный...) ”7 дней. 10.01.2004) даецца шырокі агляд беларус-кага анімацыйнага кіно – ад самага пачатку яго ўзнікнен-ня і станаўлення да сённяшніх дзён.
Шмат матэрыялаў прысвечана творчасці беларускіх ані-матараў: І. Волчака, Э. Назарава. І. Кадзюковай, А. Тура-вай, Н. Хаткевіч.
16 лістапада ў мінскім кінатэатры “Перамога” адбыўся творчы вечар І. Кадзюковай, мультфільмы якой адносяцца да непаўторнай аўтарскай анімацыі. Гэта імпрэза распача-ла цыкл вечароў “Беларуская анімацыя: учора, сёння і ... заўтра”. Прыхільнікі таленту І. Кадзюковай змаглі ўба-чыць рэтраспектыўны паказ “Каляднага цыкла” і пазнаё-міцца з новай анімацыйнай работай рэжысёра “Легенда пра ледзі Гадзіву”, якая была прызнана лепшай у праграме мультыплікацыйных фільмаў VI Міжнароднага фестывалю дзіцячых і юнацкіх фільмаў “Лістападзік-2004”.
Не засталася без увагі творчасць маладых кінематагра-фістаў, студэнтаў рэжысёрскага курса М. Пташука, пасля смерці якога маладых творцаў пад сваю апеку ўзяў рэ-жысёр В. Нікіфараў. Артыкулы А. Расінскага “Маладое кіно паміж былым і мінулым” (Наша Ніва. 19.11.2004), А. Ждановіч “Белорусская семерка” (Бел. рынок. 1.11.2004), Д. Перагудавай “Город молодых” і В. Нікіфарава “Они при-шли совсем молодыми в кинематограф, который еще и сам для себя ничего не решил...” (На экранах. 2004. N 8–9), І. Завадскай “После бала: Семеро выпускников кинорежис-серского курса М. Пташука могут остаться без работы” (Сов. Белоруссия. 30.06.2004) прадстаўляюць не толькі твор-чыя партрэты пачынаючых рэжысёраў, але і раскрываюць асаблівасці іх мастацкай манеры, узнімаюць менавіта тыя праблемы, якія паўстаюць сёння перад

выпускнікамі рэ-жысёрскага курса Беларускай акадэміі мастацтва.
5 лістапада ў кінатэатры “Перамога” адбылася творчая сустрэча з прадстаўнікамі маладога беларускага кіно, пры-меркаваная да 80-годдзя беларускага кінематографа і 60-год-дзя вялікай Перамогі. Гледачам прадставілася унікальная магчымасць пазнаёміцца з першымі работамі М. Субоціна, Д. Скварцова, З. Лася, Л. Дуброўскай, А. Голубева, А. Ка-нановіча, Я. Сяцько.
З 1 па 5 снежня ў кінатэатры “Цэнтральны” прайшоў V Міжнародны фестываль студэнцкіх фільмаў “Птушка Фе-нікс”, удзел у якім прынялі кінашколы 14 краін: Арменіі, Беларусі, Грузіі, Германіі, Казахстана, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны, Швецыі, Эстоніі.
2 снежня ў зале калегіі Міністэрства культуры Рэспуб-лікі Беларусь адбылася сустрэча міністра культуры Л.П. Гу-лякі з айчыннымі кінематаграфістамі, на якой абмяркоўва-лася тэма існавання і жыццядзейнасці моладзі ў сучасным беларускім кінамастацтве і кінавытворчасці. У комплексе ўзнятых падчас сустрэчы праблем гучалі пытанні прафесій-най падрыхтоўкі, стварэння цікавай і высакаякаснай пра-дукцыі і яе годнай рэалізацыі, фінансавай падтрымкі ма-ладых кінематаграфістаў, фарміравання айчыннага інсты-тута прадзюсерства, адсутнасці на кінастудыі годнага сцэ-нарнага партфеля і інш. Падрабязная інфармацыя пра гэта мерапрыемства даец-ца ў артыкуле Т. Команавай “Сучасны твар беларускага кі-нематографа: пластычная аперацыя ці натуральнае амала-джэнне?” (Культура. 2004. N 49).
Асобная ўвага надаецца міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне кінематаграфіі. Шырока ў прэсе аглядалася праца над першым беларускім тэлесерыялам «Отель “Исполнение желаний”» (рэж. І. Васільева) і мастацкім фільмам “Дунеч-ка” (рэж. А. Яфрэмаў), створаных пры падтрымцы расій-скіх калег. Кінастудыя “Беларусьфільм” працягвае супра-цоўніцтва з замежнымі кампаніямі. Адна з апошніх расій-скіх работ, у якой удзельнічаюць маладыя беларускія ак-цёры – 12-ці серыйны тэлевізійны фільм “Курсанты” рэ-жысёра А. Кавуна (г. Санкт-Пецярбург).
У значнай ступені знаёмству прадстаўнікоў іншых краін з беларускімі кінастужкамі садзейнічае рэгулярнае правядзенне Дзён беларускага кіно. У гэтым годзе Дні бе-ларускага кіно прайшлі ў Польшчы, Славакіі, у г. Навасі-бірску (у рамках Года культуры Беларусі ў Расіі).
Па-ранейшаму адной з галоўных тэм застаецца развіц-цё беларускага нацыянальнага кінематографа, павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускай фільмапрадукцыі на між-народных кінарынках і фестывалях. Сучаснае беларускае кіно павінна не толькі захаваць сваю

нацыянальную адмет-насць і быць вядомым сярод іншых нацыянальных кінема-таграфій, але і стаць часткай агульначалавечага культур-нага кантэксту.
У апошні час усё больш актуальнымі становяцца праб-лемы абароны аўтарскіх правоў, цэнзуры, кінапраката, па-ляпшэння кінаабслугоўвання насельніцтва, падтрымкі філь-мавытворчасці і фінансавання кінапраектаў. У плане дзей-насці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь на 2004 г. перад беларускімі кінематаграфістамі была пастаўлена за-дача пошуку пазабюджэтных сродкаў фінансавання кіна-вытворчасці, аднак гэта праблема не знайшла належнага адлюстравання на старонках газет.
Не засталася без увагі праблема аднаўлення дзейнасці Рэспубліканскага дома кіно, які павінен стаць творчым цэнтрам беларускіх кінематаграфістаў. Закраналася такса-ма канфліктная сітуацыя паміж унітарным прадпрыем-ствам “Кінавідэапракат” і “Беларускім саюзам кінематагра-фістаў”, звязаная са стварэннем Рэспубліканскага дома кі-но ў памяшканні кінатэатра “Партызан” у г. Мінску. (Бо-рисенок Т. Дом кино возрождается // 7 дней. 2004. 26 авг.; Волчак І. Дом кіно: адрас вызначаны // Культура. 2004. № 31–32; А. Николаева. Важнейшее из искусств обрело прописку // Рэспубліка. 2004. 28 жн.; Об утверждении строительного проекта и обеспечения деятельности Дома кино в г. Минске: Решение Минского городского исполни-тельского комитета от 22 июля 2004 г. № 1448 // Мин. курьер. 2004. 9 авг.).
У пачатку кастрычніка стартавала акцыя “Беларускія кінематаграфісты – Міншчыне”, прымеркаваная да 80-га-довага юбілею беларускага кіно. Ініцыятарамі і арганізата-рамі акцыі выступілі “Беларускі саюз кінематаграфістаў і УП “Кінавідэапракат” Мінаблвыканкома. Працягнецца яна да канца года і ахопіць усе раёны вобласці. Жыхарам Мін-шчыны пакажуць лепшыя ўзоры беларускага ігравога, дакументальнага і анімацыйнага кіно апошніх гадоў (Бруе-вич Н. К сельчанам едет хорошее кино // Бел. нива. 2004. 8 окт.; Бобрицкая А. Комплимент для режиссера // Мін. праўда. 7 кастр. 2004; Ахремчик Т. Знай родное синема! // Нар. газ. 2004. 6 кастр.).

Публікацыі ў рэгіянальнай прэсе ў асноўным прысвеча-ны праблемам кінапракату і стану матэрыяльна-тэхнічнай базы кінатэатраў (Крейдич М. Кина не будет? Реорганиза-ция как форма развала // Веч. Брест. 2004. 25 февр.; Сыс В. Новое рождение кинотеатра // Гомел. праўда. 2004. 30 ве-рас. [Аб адкрыцці новай кінаканцэртнай залы “Октябрь” у Чачэрску]; Ларин С. “Товарищ” зазвучал по-новому // Веч. Бобруйск.

2004. 16 июня. [Аб аснашчэнні бабруйскага кі-натэатра “Товарищ” акустычнай сістэмай “Долбі”] і многія інш.).

Абагульняючы матэрыял, прысвечаны адлюстраванню асноўных пытанняў культуры і мастацтва Беларусі ў дзяр-жаўных друкаваных СМІ ў 2004 г., можна канстатаваць, што амаль усе аспекты функцыяніравання сферы культуры і мастацтва, дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на захаван-не культурнага і духоўнага патэнцыялу нацыі, знаходзяць належнае месца на старонках газет і часопісаў. Увага срод-каў масавай інфармацыі да той ці іншай праблемы, безу-моўна, залежыць ад маштабу і ўзроўню гэтай праблемы альбо культурнай акцыі, аб чым красамоўна сведчаць пры-ведзеныя ў артыкуле статыстычныя даныя. У параўнанні з мінулымі гадамі газета “Культура” пастаянна трымала ў полі зроку пытанні, якія разглядаліся на пасяджэннях калегій Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Най-больш актуальным тэмам, а таксама выніковай калегіі 2003 г., якая адбылася на пачатку 2004 г., былі прысве-чаны аналітычныя матэрыялы, інтэрв’ю і каментарыі кі-руючых работнікаў. Падставай для прыцягнення ўвагі ўсіх сродкаў масавай інфармацыі, дзяржаўных органаў улады да праблем галіны з’яўляецца і прафесійнае свята – Дзень работнікаў культуры. У 2004 г. з гэтай нагоды ў дзяржаў-най рэспубліканскай і рэгіянальнай прэсе было апублікава-на каля 50 артыкулаў.

*Л.В. Гарбачова, загадчык аддзела навуковай інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва НББ, В.Я. Мазура, галоўны бібліёграф, К.У. Прэнц, галоўны бібліёграф, Л.Г. Гу-шчынская, вядучы бібліёграф*